14. *Мишин, П. И.* Концепт пересечения дороги в традиционной картине мира белорусов: на примере одной магической практики (по материалам Лепельского района) / П. И. Мишин // III Лепельскія чытанні: матэрыялы навук.-практ. канф., 10 кастр. 2008 г. – Лепель: Лепельскі раённы краязнаўчы музей, 2008. – С. 128–131.

15. Лепельскія чытанні: матэрыялы VI навук.-практ. канф. (Лепель, 17–18 каст. 2014 г.) / рэдкал.: Я. А. Грэбень, А. У. Стэльмах. – Мінск: Медысонт, 2014. – 247 с.

16. Каб жыла Беларусь: арт., успаміны, інтэрв'ю / А. Белакоз. – Мінск: Беларус. кнігазбор, 2003. – 103 с.

17. *Белакоз, А.* Музей у Гудзевічах / А. Белакоз. – 2012. – Кн. 1.– 199 с.

18. *Калбаска, А.* З вопыту стварэння гісторыка-культурнага запаведніка ў Заслаўі (май 1988 – кастр. 1994 г.) / А. Калбаска // Заслаўскія чытанні 1995 г.: матэрыялы міжнар. канф. «Гісторыя і культура Заслаўя ў святле агульнанацыянальных праблем», Заслаўе, 9–11 лістап. 1995 г. / уклад., навук. рэд.: Т. С. Скрыпчанка. – Заслаўе, 1997. – С. 9–12.

19. *Касцюкевіч, М. І.* Старажытнае рамяство ў старажытным горадзе / М. І. Касцюкевіч // Заслаўскія чытанні 1995 г.: матэрыялы міжнар. канф. «Гісторыя і культура Заслаўя ў святле агульнанацыянальных праблем», Заслаўе, 9–11 лістап. 1995 г. / уклад., навук. рэд.: Т. С. Скрыпчанка. – Заслаўе, 1997. – С. 116–119.

**(Дата падачы: 28.02.2019 г.)**

*С. А. Шыдлоўскі*
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Наваполацк

*S. A. Shydlouski*
Polotsk State University, Novopolotsk

**УДК 392.3(476)«18»**

## ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПАДСТАВЫ ВЫХАВАННЯ Ў ДВАРАНСКІХ ПАМЕШЧЫЦКІХ СЕМ'ЯХ БЕЛАРУСІ (канец XVIII – пачатак XX ст.)

## THEORETICAL FOUNDATIONS OF EDUCATION IN NOBLE LANDLORD FAMILIES OF BELARUS (LATE XVIII – EARLY XX CENTURIES)

*У дадзеным артыкуле аналізуюцца тэарэтычныя падставы выхавання ў дваранскіх памешчыцкіх сем'ях Беларусі. Даследуюцца крыніцы ідэйных уплываў і мастацкія ўзоры для пераймання. Дваранскі маёнтак разглядаецца як адукацыйнае асяроддзе, якое з'яўлялася важным фактарам у практыках выхавання і хатняга навучанне дзяцей у памешчыцкіх сем'ях Беларусі канец XVIII – пачатак XX стст.*

*Ключавыя словы: ідэалы, мэты і метады выхавання, традыцыі выхавання, беларускае дваранства, памешчыцкая сям'я*

*In this article the noble estate of Belarus of the end of XVIII-the beginning of XX centuries is considered as the educational environment which was an important factor in practices of education and home training of children in landowner families. Theoretical foundations of education in noble landowner families of Belarus are analyzed. Sources of ideological influences and role models are given.*

*Key words: ideals, objectives and methods of education, traditions of education, the Belarusian nobility, landowner family*

Выхаванне ў арыстакратычных сем’ях звычайна насіла праектны характар: мэта і задачы выхаваўчага працэсу артыкуляваліся, ён засноўваўся на пэўным педагагічным ідэале [1]. Пад педагагічным ідэалам разумеецца гістарычна зменлівае ўяўленне аб дасканалым чалавеку і яго прызначэнні, што дэтэрмінуе выбар мэты і метадаў выхавання. Мэта выхавання – гэта чаканыя змены ў асобе, якія адбываюцца ў выніку выхаваўчага ўплыву, а педагагічныя метады, у сваю чаргу, з'яўляюцца спосабам рэалізацыі мэты выхавання [2].

Фарміраванне выхаваўчай траекторыі вымагала ад бацькоў наяўнасці высокаразвітой педагагічнай культуры, угрунтаванай на веданні як традыцыйных практык, так і тэарэтычных падстаў выхавання. Уяўленні аб дасканалай асобе ў асяроддзі заможных землеўладальнікаў фарміраваліся пад уплывам розных фактараў, сярод якіх варта адзначыць педагагічныя тэорыі эпохі. На педагагічны ідэал уплывалі таксама палітычныя і філасофскія перакананні бацькоў. Дыдактычныя прыклады найчасцей знаходзілі ў аналах антычнай і біблейскай гісторыі.

Распаўсюджванню новых уяўленняў аб выхаванні паспрыяла дзейнасць філосафаў-асветнікаў, у першую чаргу Д. Лока, К. Гельвецыя, Ж.-Ж. Русо, І. Песталоці, Ф. Фробеля, якія разглядалі дзяцінства як найбольш важны перыяд у развіцці чалавечай індывідуальнасці. Педагагічная навука эпохі Асветніцтва прадвызначыла працэс «эмансіпацыі дзяцінства», які разгортваўся на мяжы XVIII–XIX стст. і адзначыўся ўзнікненнем большай аўтаномнасці дзіцячай асобы ў свеце дарослых – прынамсі, у заможных арыстакратычных сем’ях і ў ліберальных свецкіх адукацыйных установах.

Знешнім адлюстраваннем дадзеных тэндэнцый з'яўляецца партрэтны жывапіс разглядаемага перыяду. Калі вобраз дзяцей у выяўленчым мастацтве эпохі барока і класіцызму адпавядаў ідэалу «маленькага дарослага» (напрыклад, партрэт князя Іераніма Вінцэнта Радзівіла з сынам Дамінікам Іеранімам канца XVIII ст.; партрэт 1808 года Амеліі Агінскай Ф.-К. Фабра), то бліжэй да сярэдзіны XIX ст. ён трансфармуецца ў больш аўтэнтычную дэманстрацыю феномену дзяцінства, хоць і не пазбаўленую пэўнай ідэалізацыі. Найбольш шырока дзіцячая субкультура дваранскага маёнтка Беларусі прадстаўлена ў творчасці айчыннага мастака І. Ф. Хруцкага 30–50-х гг. XIX ст. Менавіта ў рэтраспектыве развіцця жывапісу І. Ф. Хруцкага можна назіраць як змяняўся выяўленчы вобраз дзяцінства – ад эфектнага акадэмізму да больш рэалістычнай манеры. Міміка, жэсты, поза, заняткі дзяцей, якія адлюстроўваліся на палотнах дадзенага часу, неслі ўжо больш адзнак дзіцячай самабытнасці. Дзіцячая асоба ў адзначаны перыяд пачынае характарызавацца праз уласцівыя менавіта дзяцінству рэчавыя атрыбуты (напрыклад, цацкі). Партрэтны жывапіс дапамагае таксама зафіксаваць змены ў дзіцячым строі: у адрозненні ад папярэдніх эпох дзяцей пачынаюць паказваць на мастацкіх палотнах у вопратцы, якая не капіруе дарослую, а больш адпавядае канстытуцыі дзіцячага цела, яго рухальнаму рэ-

жыму. Візуальныя вобразы дзяцінства прысутнічаюць у творчай спадчыне Ф. Смуглевіча, І. Аляшкевіча, Ю. Пешкі, Я. Рустэма, В. Ваньковіча, якая можа служыць дадатковай крыніцай для даследавання матэрыяльнай і духоўнай культуры айчыннага памеснага дваранства.

Узоры і ідэалы для наследавання прадстаўляла таксама мастацкая літаратура. Кніжны рынак з'яўляўся індыкатарам росту ўвагі грамадскай думкі да праблем выхавання і адукацыі. 80-ыя гг. XVIII ст. сталі часам з'яўлення першых дзіцячых часопісаў як на рускай («Детское чтение для сердца и разума»; 1785–1789), так і на польскай («Przyjaciel Dzieci»; 1789–1792) мовах. З канца XVIII – 20-х гг. XIX ст. фарміруецца масавая дзіцячая літаратура. Дзіцячая кніга разглядалася перадусім у якасці сродку выхавання. Як следства, пераважалі дыдактычна-алегарычныя творы [3]. З-за браку айчынных аўтараў дзіцячая бібліятэка дадзенага перыяду складалася пераважна з твораў замежных пісьменнікаў. Замежная мастацкая літаратура эпохі сентыменталізму і рамантызму вучыла бацькоў звяртаць большую ўвагу на ўнутранае жыццё дзіцяці. Дзеці мясцовых памешчыкаў знаёміліся з творамі французскіх, нямецкіх, англійскіх аўтараў – А. Беркеня, С. Жанліс, І. Кампэ, Ж.-М. Лепрэнс дэ Бамон, Ш. Перо, Ф. Фенелона, М. Эджварт як у арыгінале, так і дзякуючы перакладам на польскую і рускую мовы. Айчынныя пісьменнікі (Я. Баршчэўскі, Г. Жавускі, Э. Масальскі, Ул. Сыракомля, І. Ходзька, Э. Ажэшка) таксама закранал ў сваіх творах праблемы выхавання і дзяцінства.

Найноўшыя педагагічныя, псіхалагічныя, гігіенічныя веды папулярызаваліся ў грамадска-палітычнай прэсе, выходзілі спецыялізаваныя дапаможнікі для бацькоў і настаўнікаў. На працягу XIX ст. адным з галоўных інструментаў пашырэння педагагічных ведаў зрабіліся «часопісы для жанчын». Першым рускамоўным спецыялізаваным часопісам падобнага кшталту было літаратурна-мастацкае выданне М. І. Новікава «Модное ежемесячное издание, или Библиотека для дамского туалета» (1779). У 1818 г. пачало выходзіць польскамоўнае выданне «Tygodnik Polski i Zagraniczny», якое паслядоўна звярталася да жаночай аўдыторыі. У XIX ст. выходзілі некалькі дзясяткаў рускамоўных і польскамоўных перыядычных выданняў, якія былі разлічаны на жаночую і, больш шырока, сямейную аўдыторыю. Грамадскі рэзананс атрымалі такія выданні як «Дамский журнал» (Москва; 1823–1833), «Вестник парижских мод» (Москва; 1836–1850), «Лучи» (Санкт-Пецярбург; 1850–1860), «Bluszcz» (Варшава; 1865–1918, 1921–1939), «Magazyn Mód» (Варшава; 1835–1859), «Tygodnik Mód i Nowości Dotyczących Gospodarstwa Domowego» (Варшава; 1860–1915). Хоць яны выходзілі па-за межамі этнічных беларускіх зямель, аднак мясцовыя падпісчыкі мелі магчымасць чытаць іх рэгулярна. На старонках жаночых часопісаў з'яўляліся допісы мясцовых аўтараў, напрыклад, з варшаўскімі выданнямі супрацоўнічала Э. Ажэшка.

У айчыннай польскамоўнай педагагічнай літаратуры адным з першых папулярызатараў новых падыходаў да выхавання дзяцей, у прыватнасці ідэй Ж.-Ж. Русо, з'яўляецца А. Снядэцкі (1768–1838), аўтар трактата «O fizycznym wychowaniu dzieci» (публікацыя ў «Dzienniku Wileńskim» у 1805 г.; асобным выданнем у 1840 г.). Галоўнай мэтай выхавання ён называе фарміраванне шчаслівых людзей, што, на думку філосафа, падразумявала адначасова развіццё фізічнае (моц, здароўе, даўгалецце) і маральнае (інтэлектуальнае). Паводле А. Снядэцкага, чалавек, які здолеў выбудаваць для сябе шчаслівае жыццё, хутчэй за ўсё будзе карысным і для грамадства [4, s. 4–9]. Ідэі А. Снядэцкага, якія спалучаюць апалогію асабістага шчасця з прызнаннем неабходнасці служэння грамадскай карысці, узыходзяць да твора Д. Лока «Some thoughts concerning education» («Думкі аб выхаванні»; 1693).

Аб важнасці маральнага самавыхавання гаворыцца ў «Пятнаццаці правілах паводзін для моладзі…» (Piętnaście prawideł postępowania dla młodzi należącej do zgromadzenia Przyjaciół [...]; 1820) Т. Зана (1796–1851), адрасаваных віленскаму студэнцтву. Паводле Т. Зана, юнак мусіць імкнуцца да таго, каб быць сціплым, цнатлівым, таварыскім, добра адукаваным. Маладым людзям у «Пятнаццаці правілах…» прапанавалася складаць асабістыя планы самаўдасканалення [7, s. 88].

У 1818 г. на старонках часопіса «Месячнік Полацкі» («Miesięcznik Połocki») быў апублікаваны артыкул «Заўвагі аб адукацыі моладзі» («Uwagi nad wychowaniem młodzieży») езуіта Ж. Л. Разавена (1772–1851). У адрозненні ад канцэпцыі А. Снядэцкага (выхавання для ўласнага шчасця), Ж. Л. Разавен робіць акцэнт на патрэбе падпарадкавання асобы рацыям грамадскага служэння, што было камплімéнтарна ўяўленням патрыятычна арыентаваных колаў шляхецкага грамадства. Паводле высноў аўтара, выхаванне мае на мэце маральнае і інтэлектуальнае развіццё дзіцяці і мусіць служыць задачам фарміравання асобы будучага грамадзяніна, здатнага належным чынам выконваць свае абавязкі перад Радзімай. Падобнаму заданню, на думку публіцыста, найлепш адпавядала рэлігійнае навучанне, а таксама развіццё розуму пры дапамозе старагрэчаскай і лацінскай моў [5, s. 98–99; 6, s. 230–236].

А. Снядэцкі і Ж. Л. Разавен прадстаўлялі дзве ідэйныя плыні, якія прысутнічалі ў педагагічнай думцы Беларусі на працягу вывучаемага перыяду. Ліберальныя асветніцкія погляды, выразнікам якіх з’яўляўся А. Снядэцкі, папулярызаваліся на старонках віленскай прэсы (Dziennik Wileński, Tygodnik Wileński, Wiadomości Brukowe), гучалі ў публічных выступах краёвай інтэлігенцыі. Аднак у адукацыйных практыках больш запатрабаванымі заставаліся ідэі, якія агучыў Ж. Л. Разавен, – і ў сямейным, і ў школьным навучанні назіраўся сінтэз элементаў рэлігійнага і патрыятычнага выхавання. Падобная тэндэнцыя была ўласціва не толькі для айчын-

нага польскамоўнага асяроддзя, – аблічча расійскай гімназіяльнай сістэмы ў многім акрэслівала класічная філалогія і Закон Божы.

Калі ў творах А. Снядэцкага пры аналізе педагагічнага працэсу пільная ўвага надаецца фізічнаму выхаванню, у Ж. Л. Разавена – рэлігійнаму (маральнаму), то Э. Масальскі (1799–1879), які вучыўся як у полацкіх езуітаў, так і ў Віленскім універсітэце, лічыў, што з пункту гледжання шляхціца-абывацеля найбольш каштоўным з’яўляецца выхаванне свецкае, што падразумявала веданне замежных моў, уменне танцаваць і трымаць сябе ў грамадстве. Падобная пазіцыя не выключала разумення важнасці выхавання інтэлектуальнага і маральнага [8, s. 240].

У сярэдзіне XIX стагоддзя з крытыкай новых тэндэнцый у айчыннай педагогіцы выступіў Ф. Бохвіц («Pomysły o wychowaniu człowieka», 1847). Ф. Бохвіц (1799–1856) тэарэтызуе над традыцыйнымі стэрэатыпамі і практыкамі выхавання ў шляхецкіх памешчыцкіх сем'ях сярэдзіны XIX ст., прыводзячы аргументы супраць шкодных на яго думку наваццый, сярод якіх ён, напрыклад, называе жаночую эмансіпацыю і пашырэнне школьнай адукацыі сярод дзяўчынак, а таксама моду на вывучэнне замежных моў (у першую чаргу французскай). На думку філосафа, выхаванне падобна да земляробства, – настаўнік як садоўнік фарміруе свайго выхаванца такім чынам, каб грамадства атрымала найлепшы плён. У дадзеным працэсе, паводле Ф. Бохвіца, мараль і вера мусяць мець прыярытэт над розумам, а найбольш карыснымі вучэбнымі прадметамі з’яўляюцца тыя, якія грунтуюцца на рэлігіі, гісторыі і правазнаўстве [9, s. 71]. Да дзевяцігадовага ўзросту, на думку Ф. Бохвіца, выхаваннем дзіцяці павінна займацца жанчына-педагог (у першую чаргу маці), а пасля гэтай узроставай мяжы – мужчына. Найбольш прадуктыўна працэс выхавання і адукацыі развіваецца ў першыя дваццаць год жыцця чалавека, якія і варта прысвяціць навучанню [9, s. 27–29]. Паводле Ф. Бохвіца, хлопчыкаў трэба выхоўваць мужнымі (адважнымі, рашучымі, самаахвярнымі) і прызвычайваць іх «да працы механічнай і разумовай». Жанчына, на думку Ф. Бохвіца, прыўносіць у сям’ю набожнасць, прыстойнасць, чысціню, парадак і прыгажосць. Менавіта ў сферах маралі і эстэтыкі жанчына здольная накіроўваць памкненні мужчыны. Найлепшую падрыхтоўку дзеля выканання дадзенай місіі жанчына, паводле Ф. Бохвіца, можа атрымаць толькі ў працэсе хатняга навучання [9, s. 34, 37].

Яшчэ ў 1806 г. Т. Чацкі ў тэксце «Mowa o pożytkach z wychowania publicznego i domowego» аргументавана даводзіў перавагі школьнай адукацыі над практыкай навучання ў сям’і [10]. Аднак ужо ў 30–40-х гадах XIX ст., пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта (1832), Крамянецкага ліцэя (1831) і пераводу школьнага навучання ў краі на рускую мову, падобная апалогія школьнай адукацыі ў польскамоўных публічных выказваннях на педагагічную тэму знікае. Умацоўваецца прэстыж хатняй адукацыі, вядучая роля ў арганізацыі якой адводзіцца маці.

Патрыятычны ідэал «маткі-полькі» асабліва шырока абвяшчаўся на старонках польскамоўнай прэсы ў другой палове XIX ст. Сам вобраз польскай маці ў мясцовай грамадскай думцы ўзыходзіў да ідэалагічных і мастацкіх канструкцый эпохі позняга асветніцтва (1795–1822) і рамантызму (напрыклад, верш А. Міцкевіча «Do matki Polki» 1830 г.). У публіцыстычных і мастацкіх тэкстах зрабілася распаўсюджаным вобразнае параўнанне маці з Радзімай, у цэлым назіралася фемінізацыя вобраза Айчыны (падобную тэндэнцыю можна прасачыць у творах Я. Баршчэўскага) [11]. Дадзеныя ідэалагічныя тэндэнцыі станоўча карэлявалі з умацаваннем культу Маці Божай у каталіцкім асяроддзі. Усё разам гэта спрыяла павышэнню сацыяльнага статусу мацярынства і прэстыжу сямейнага выхавання і адукацыі ў памешчыцкім асяродку.

Такім чынам, пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта (1832) і расфарміравання Віленскай навучальнай акругі, што прыводзіла да рэдукцыі польскага выхаваўчага кампаненту ў школьнай адукацыі, узрасло значэнне хатняга выхавання. У педагагічных тэорыях і практыцы разглядаемага перыяду было прынята вылучаць у агульнай плыні выхаваўчага працэсу выхаванне фізічнае, маральнае, інтэлектуальнае і эстэтычнае. Варта адзначыць, што калі ў арыстакратычных сем’ях выхаванне насіла праектны характар, вызначалася большай разнастайнасцю падыходаў і ўзораў для пераймання, то ў асяроддзі небагатага дваранства гэта быў звычайна інтуітыўны працэс з апорай на традыцыйныя педагагічныя практыкі, якія засноўваліся ў першую чаргу на хрысціянскіх каштоўнасцях.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Шыдлоўскі, С. А.* Педагагічныя традыцыі паместнага дваранства Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / С. А. Шыдлоўскі // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 25 / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск: Права і эканоміка, 2018. – С. 238–243.

2. *Щербакова, С. Н.* Формирование психолого-педагогической культуры родителей: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.01 / С. Н. Щербакова; Мос. пед. гос. ун-т. – М., 1998. – 23 с.

3. *Гусева, О. В.* Проблемы изучения детской литературы XVIII столетия (на основе коллекции польских детских книг в библиотеке РАН) / О. В. Гусева // Книга в России XI–XX вв.: сб. науч. тр. – Петербург: Библиотека Российской академии наук, 2004. – С. 4–12.

4. *Śniadecki, J.* O fizycznym wychowaniu dzieci / J. Śniadecki. – Sanok: K. Pollak, 1855. – 150 s.

5. *X. J. R.* Uwagi nad wychowaniem młodzieży / X. J. R. // Miesięcznik Połocki. – 1818. – T. 1. – № 2. – S. 93–107.

6. *X. J. R.* Uwagi nad wychowaniem młodzieży / X. J. R. // Miesięcznik Połocki. – 1818. – T. 1. – № 4. – S. 227–243.

7. *Zan, T.* Piętnaście prawideł postępowania dla młodzi należącej do zgromadzenia Przyjaciół [...] / T. Zan // Promieniści: filomaci–filareci / zebrał i objaśnił H. Mościcki. – Warszawa [etc.]: Nakład Gebethnera i Wolffa, 1928. – S. 87–92.

8. *Massalski, E. T.* Pan Podstolic, albo, Czém jesteśmy, czém być możemy: romans administracijny: W 5 częściach. Część 2 / E. T. Massalski. – Wilno: W Drukarni A. Marcinkowskiego, 1831. – 268 s.
9. *Bochwic, F.* Pomysły o wychowaniu człowieka / F. Bochwic. – Wilno: Nakład i druk Teofil Glücksberg, 1847. – 136 s.
10. *Czacki, T.* Mowa o pożytkach z wychowania publicznego i domowego / T. Czacki. – Krzemieniec, 1806. – 14 s.
11. *Хаўстовіч, М. В.* Гісторыя беларускай літаратуры 30–40-х гг. XIX ст. / М. В. Хаўстовіч. – Мінск: БДУ, 2001. – С. 165.

**(Дата падачы: 20.02.2019 г.)**

*С. Ф. Шимукович*
Республиканский институт высшей школы, Минск
*S. Shymukovich*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 327.8:94(470+476+480)"18/19"**

# ТРЕТИЙ НЕ ЛИШНИЙ: О БЕЛОРУССКОМ УЧАСТИИ В РОССИЙСКО-ФИНЛЯНДСКОЙ НАУЧНОЙ ИНИЦИАТИВЕ ПО ИЗУЧЕНИЮ ЭЛИТ

# THE THIRD IS NOT SUPERFLUOUS : ON BELARUSIAN PARTICIPATION IN THE RUSSIAN-FINNISH RESEARCH INITIATIVE FOR THE STUDY OF ELITES

*В данном материале обосновывается необходимость участия белорусских историков в проведении финляндско-российской научной конференции, посвященной представлению результатов исследований российских и финских историков по вопросам истории имперского периода двух современных суверенных государств. Белорусские земли в XIX – начале XX веков также входили в состав Российской империи и многие проблемы ее истории могут быть рассмотрены в сравнении с историей российско-финских взаимоотношений имперского периода.*

*Ключевые слова: история Финляндии XIX века; история России XIX века; история Беларуси XIX века; научная конференция; элиты; государство; Российская империя.*

*This article substantiates the need for the participation of Belarusian historians in the Finnish-Russian scientific conference devoted to the presentation of the results of studies of Russian and Finnish historians on the history of the Imperial period of the two modern sovereign States. Belarusian lands in the XIX-early XX centuries were also part of the Russian Empire and many problems of its history can be considered in comparison with the history of Russian-Finnish relations of the Imperial period.*

*Key words: Finnish history in XIX century; the history of Russia in XIX century; the history of Belarus in XIX century; scientific conference; the elite; the state; the Russian Empire.*

12–14 сентября 2018 года в Санкт-Петербурге состоялась III-я российско-финляндская конференция «Элиты и государство. Создание, распад и переосмысление государства и систем управления, 1725–1925», посвящен-